Рарытэты

# ГІСТОРЫЯ КАРТАГРАФІІ: АД «А» ДА «Я»



**Унікальныя картаграфічныя матэрыялы і тапаграфічнае абсталяванне можна ўбачыць у БДУ. Калекцыі размешчаны на базе факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі.**

Тапаграфічная выстаўка адлюстроўвае эвалюцыю тэхнічных характарыстык геадэзічнага абсталявання, пачынаючы з XX стагоддзя. Гэтыя прыборы ў розны час выкарыстоўваліся для тапаграфічнай здымкі пры складанні планаў і картаў. Самым рарытэтным з'яўляецца вымяральны прыбор тэадаліт, выпушчаны на расійскай фірме Ф. Швабэ ў пачатку XX стагоддзя. Усяго датаваных гэтым перыядам прыбораў налічваецца каля 1650 штук. А канкрэтна гэты тэадаліт выкарыстоўваўся для вымярэння гарызантальных і вертыкальных вуглоў, а таксама магнітных азімутаў напрамкаў на мясцовасці. Менавіта гэтае абсталяванне падняло геадэзічныя здымкі на новы ўзровень з больш высокай дакладнасцю вымярэнняў.

У рамках экспазіцыі прадстаўлена больш за 30 геадэзічных прыбораў. Акрамя таго, выстаўлены чарцёжныя прылады і рукапісныя арыгіналы здымак. Характэрна, што ўсё абсталяванне знаходзіцца ў рабочым стане і будзе задзейнічана пры вывучэнні дысцыпліны «геадэзічнае інструментаводства».

Картаграфічная выстаўка дэманструе развіццё гэтай галіны ў Беларусі за 95-гадовы перыяд. Айчынная картографа-геадэзічная вытворчасць вядзе свой адлік з 1923 года, калі было створана Беларускае геадэзічнае ўпраўленне ў пасёлку Навабеліца паблізу Гомеля, на базе якога ў 1934 годзе адкрылася Беларуская картаграфічная фабрыка. Ужо ў 1936 годзе яна была пераведзена ў сталіцу і цяпер яе правапераемнікам з'яўляецца Мінская друкарская фабрыка Дзяржзнака.

Сярод экспанатаў прадстаўлены больш за 150 геаграфічных атласаў і розных па тэматыцы картаў. Унікальнымі выданнямі на картаграфічнай выстаўцы з'яўляюцца «Andrees Handatlas» (1899 год) Вялікі Сусветны настольны Атлас Маркса (СПб.: выдавецтва А. Ф. Маркс, 1906 год), «Кліматычны Атляс Беларусі» (1927 год), «Атлас афіцэра РСЧА» (1938 год), Вялікі савецкі атлас свету (1939 год). Ёсць у ліку экспанатаў «Атлас свету» (1954 год), «Атлас Беларускай ССР» (1958 год), шматтомныя выданні Марскога атласа і Атласа акіянаў, нацыянальныя атласы Кубы і Мангольскай Народнай Рэспублікі, а таксама комплексныя атласы саюзных рэспублік СССР, сучасныя картаграфічныя выданні Украіны, Польшчы і Расіі. Акрамя таго, прадстаўлены сучасныя «Геаграфічны атлас настаўніка» і «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» ў чатырох тамах і іншае.

Тапографа-геадэзічнае абсталяванне і картаграфічныя матэрыялы сабраны калектывам кафедры геадэзіі і касмааэракартаграфіі як з фонду факультэта, так і з асабістых калекцый супрацоўнікаў. Экспазіцыі будуць дзейнічаць на пастаяннай аснове і выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы спецыялістаў па картографа-геадэзічнай дзейнасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Пантэон Айчыны

# АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ

*(1733—1785)*



Ужо ў дзяцінстве Антоній — нашчадак лівонскага роду, што асеў на Беларусі, — вылучаўся сярод таварышаў па вучобе ў Віленскай езуіцкай школе. Няўрымслівы і дзейсны юнак з цяжкасцю праходзіў навучанне. Бурлівая натура не дазваляла яму засярodзіцца на адным занятку. Кніг чытаць ён не любіў, маўляў, у яго свой адметны розум, а таму не цярпеў чужога меркавання. Упэўненасць у сваіх незвычайных здольнасцях і сілах штурхала яго на вялікія справы.

На далейшы лёс Тызенгаўза вельмі паўплывала сяброўства з будучым каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім, калі яны знаходзіліся ў Воўчыне пры двары ўплывовых князёў Чартарыйскіх. Юнакоў збліжала шчырае жаданне высокага служэння Айчыне, шмат казалася пра бядотны стан дзяржавы і неабходнасць рэформаў.

Але да пары да часу абодвум даводзілася прыладкоўвацца да тагачаснага дзяржаўнага жыцця. Кожны ішоў сваім шляхам. Станіслаў Аўгуст апынуўся ў Пецярбургу як пасол Рэчы Паспалітай і неўзабаве стаў палюбоўнікам расійскай імператрыцы Кацярыны II. Калі ў 1764 годзе імператрыца захацела ўзвесці на каралеўскі пасад Панятоўскага, Антоній Тызенгаўз, на той час усяго толькі гарадзенскі падстароста і велікакняжацкі пісар, шчыра падтрымаў яго кандыдатуру. Стаўшы каралём, Станіслаў Аўгуст аддзячыў сябру — узнагародзіў ордэнам святога Станіслава, надаў пасады гарадзенскага старосты і галоўнага падскарбія літоўскага (міністра фінансаў), а яшчэ зрабіў кіраўніком велікакняжацкіх эканомій (гаспадарчых уладанняў). Кароль падтрымаў Тызенгаўза ў яго планах эканамічнага рэфармавання гаспадарчых уладанняў. Своеасаблівым выпрабавальным палігонам стала Гародня. Тут Тызенгаўз прапанаваў стварыць буйны эканамічны і культурны цэнтр, па сутнасці зрабіць «каралеўскі горад» сапраўды каралеўскім.

З уласцівай яму энергіяй і самаўпэўненасцю Антоній узяўся за справу. Пры ўсіх яго недахопах нельга не адзначыць перакананасць Тызенгаўза ў патрэбе адукацыі для народа, бо, на яго думку, росквіт краіны і яе магутнасць найпрост залежалі ад увядзення асветы і адукаванасці грамадзян. Адно ён не мог зразумець, што гэта немагчыма ў Рэчы Паспалітай, якая развалілася на часткі ад шляхецкай вольнасці і пагрузілася ў рэлігійны містыцызм на ўзор Сярэднявечча. Само грамадства, якое знаходзілася ў чадзе былой велічы, баялася ўсякіх пераўтварэнняў. І няхай Тызенгаўз не ведаў адпачынку, спаў па пяць гадзін, ірваў жылы, але яму аднаму было не па сілах зрушыць наперад грувасткую дзяржаўную машыну. Хоць яго дасягненні ўражваюць: заснаваў больш за 20 фабрык, заводаў і мануфактур, на якіх выраблялі сукно, шоўк, аксаміт, залатыя ўпрыгажэнні, карэты, цвікі, замкі, зброю і шмат іншага. Каля трох тысяч майстроў і рабочых працавала там — але рабочыя былі не вольныя, а прыгонныя сяляне, працавалі пад прымусам наглядчыкаў, а значыць, і праца іх была малаэфектыўная, а то і ўвогуле стратная. Праз сваю ўпартасць Тызенгаўз не закрываў стратныя прадпрыемствы. «Я не звыкся кідаць пачатую справу».

Сваёй дзейнасцю Антоній Тызенгаўз хацеў ахапіць усе сферы жыцця — эканамічную, культурную, грамадскую і палітычную. Па яго плане быў ачышчаны Нёман ад Гародні і аж да Віліі, выкапаны канал, які злучаў Віслу з Дняпром праз Мухавец і Піну. У Гародні былі заснаваны ветэрынарная школа, медыка-хірургічная акадэмія, бухгалтарская вучэльня, кадэцкі корпус, нядзельная школка для рабочых. Вядомы французскі вучоны Жан Жылібер залажыў славуты батанічны сад. Выходзіла першая ў Беларусі "Гарадзенская газета". Дзейнічаў тэатр з аркестрам і балетнай трупай, а ў планах было адкрыццё абсерваторыі і нават акадэміі навук. Адначасова Тызенгаўз верхаводзіў палітычным жыццём у краіне на чале створанай ім каралеўскай партыі. Цяпер сесіі Трыбунала (найвышэйшага суда ВКЛ) і пасяджэнні скарбавай камісіі адбываліся ў Гародні. Кароль быў задаволены дзейнасцю Тызенгаўза, які забяспечыў каралеўскі двор усім неабходным і палітычна падтрымліваў яго. Але за кароткі час усё абрынулася.

Дзейнасць Тызенгаўза выклікала зразумелую трывогу Прусіі і Расіі, якія ўсяляк перашкаджалі пераўтварэнням у Рэчы Паспалітай. На прускія грошы (200 000 талераў) утрымлівалася вяўнічая партыя ворагаў Тызенгаўза. Іх падтрымліваў расійскі пасол Штакельберг, які хацеў прыбраць літоўскага падскарбія. Пад такім ціскам, калі на Тызенгаўза пасыпаліся абвінавачванні ў злоўжываннях і самых розных грахах, слабавольны кароль выдаў яго на расправу ворагам. Становішча стала катастрафічным, калі намоўленыя паслом банкіры адмовілі Тызенгаўзу ў крэдытах. Паводле сакрэтнага дэкрэта караля, эканоміі пераходзілі ў кіраванне Францішку Ржавускаму. А той, захапіўшы з урадавымі войскамі Гародню, па сутнасці разрабаваў прадпрыемствы, знішчыў дакументы. Тызенгаўз так і не дамогся справядлівасці ні ў Трыбунале, ні на соймах. Яго абвінавацілі ў знявазе «каралеўскай годнасці», за што нават пасадзілі пад арышт на шэсць тыдняў, «страце скарбу», «непарадках у гаспадарстве», налічылі страт на 600 тысяч злотых. Толькі каралеўскае заступніцтва выратавала яго ад смяротнага пакарання.

Свой век Тызенгаўз, пазбаўлены ўсіх пасад, дажываў у беднасці і адзіноце, знаходзячы ўцеху ў кнігах, якіх некалі так цураўся...

Толькі калі пала Рэч Паспалітая, стала зразумела, наколькі патрэбная была дзейнасць Антонія Тызенгаўза. «Быў гэта сапраўдны міністр, якога край наш патрабаваў, быў гэта геній, якога пушча Літвы ўзрасціла», — гэтыя словы польскага пісьменніка і гісторыка Юлія Нямцэвіча гучаць як эпітафія па гарадзенскім рэфарматару.

Літаратурныя партрэты

# НА ДОБРЫ ЎСПАМІН

Пісьменніка Міколу Чарняўскага аматарам літаратуры прадстаўляць асаблівай патрэбы няма. Ён — аўтар шматлікіх кніг паэзіі і прозы, уганараваны высокімі прэміямі і ўзнагародамі, а нядаўна парадаваў прыхільнікаў сваёй творчасці чарговай кнігай. У выдавецтве «Народная асвета» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь убачыў свет зборнік літаратурных партрэтаў «На парозе дабрыні і болю».




Трэба адзначыць, што даволі разгорнутыя літаратурныя партрэты на працягу апошніх гадоў аўтар друкаваў у часопісе «Полымя» і штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», і яны не былі абдзелены ўвагай чытачоў. І вось цяпер, сабраныя пад адной вокладкай, вядома ж, надоўга зберагуць памяць пра тых, хто радаваў сваім літаратурным дарам, вучыў любові да Радзімы, жыццёвай мудрасці і дабрыні. Бо дастаткова нагадаць прозвішчы тых прадстаўнікоў прыгожага пісьменства, пра якіх згадвае Чарняўскі, каб пераканацца ў гэтым. А яму пашчасціла сустракацца, быць блізка знаёмым, творча супрацоўнічаць і сябраваць з Янкам Маўрам, Артурам Вольскім, Васілём Віткам, Уладзімірам Дубоўкам, Станіславам Шушкевічам, Рыгорам Барадуліным, Анатолем Грачанікавым... Хоць, здавалася б, і добра ведаў я біяграфіі і творчасць герояў літаратурных партрэтаў, аднак дзякуючы Міколу Чарняўскаму адкрыў для сябе шмат чаго новага і цікавага. Ну хоць бы, напрыклад, чаму Уладзімір Дубоўка, які стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій і шмат гадоў правёў у Сібіры, пасля вызвалення не вярнуўся ў Мінск, а вырашыў жыць у Маскве. Гэты крок сам Дубоўка растлумачыў так: у Мінску шмат сяброў, яны будуць хадзіць да цябе ў госці, ты павінен будзеш хадзіць да іх... Ці ж да работы будзе? А задумана вельмі шмат. У Маскве цішэй, спакайней, ніхто не адрывае ад стала...

Зрэшты, Уладзімір Дубоўка часта наведваўся ў Мінск, дзе ў яго рэгулярна друкаваліся творы ў часопісах, выходзілі асобныя кнігамі ў выдавецтвах. Мікола Чарняўскі вельмі цёпла згадвае пра сустрэчы з пісьменнікам няпростага, цяжкага лёсу.

Калі ж ён некаторых літаратараў называе сваімі настаўнікамі ў літаратуры, а менавіта Алеся Пальчэўскага і Міхася Даніленку, то гэтаксама магу сказаць пра іх і я. Сваё першае апавяданне я надрукаваў у часопісе «Вясёлка», а паспрыяў гэтаму Алесь Восіпавіч. Потым я, вучань на той час, заходзіў у рэдакцыю, дзе пазнаёміўся з ім бліжэй, а перад гэтым паклаў на стол водгук на яго кнігу «Данеўцы — нашы знаёмыя», які надрукаваў у рагачоўскай раённай газеце. У той жа дзень убачыў у кабінеце Пальчэўскага Васіля Вітку і Сяргея Грахоўскага.

Што да Міхася Даніленкі, то пабач з ім я пражыў у Гомелі амаль сорак гадоў. Заўсёды прыслухоўваўся да яго парад. Сёлета на дзевяноста сёмым годзе жыцця Міхася Пятровіча не стала...

З-пад пяра Міколы Чарняўскага выйшла кніга-рэтра. Яна вымушае чытача вярнуцца назад, у мінулае, дзе жылі і тварылі на парозе дабрыні і болю сапраўдныя людзі, якімі сёння мы ганарымся.

Упэўнены, кніга літаратурных партрэтаў Міколы Чарняўскага «На парозе дабрыні і болю» стане карысным дапаможнікам для выкладчыкаў ВНУ, студэнтаў, школьнікаў, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца беларускай літаратурай, яе ўчарашнім і сённяшнім днём. Яна напісана жывой гутарковай мовай, не пазбаўлена гумару і прыгод, адкрые чытачу шмат новага, сапраўды цікавага і пазнавальнага.

**Васіль ТКАЧОЎ.**